ЛЁН ЛЮБІЦЬ ПАКЛОН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Безумоўна, не абышлося без крытыкі: Прэзідэнт звярнуў увагу на недастатковыя аб'ёмы айчыннай ільняной сыравіны, а таксама на яе якасць. На Аршанскім ільнокамбінаце трэць магутнасцяў не ўдаецца загрузіць.

Віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы заявіў, што на планы па лёне ў 2018 годзе паўплывалі неспрыяльныя ўмовы надвор'я, аднак Аляксандр Лукашэнка быў непахісны: ёсць недапрацоўкі, якія не выпраўлены, трэба не толькі аб дзяржзаказе думаць, але і аб эфектыўнай вытворчасці.

Кіраўніку дзяржавы паказалі мадэрнізаваныя цэхі, прадэманстравалі магчымасці камбіната і прадукцыю. Дарэчы, у прадпрыемства расце выручка і зарплаты, выконваюцца крэдытныя абавязацельствы.

У завяршэнні наведвання завода Прэзідэнт адзначыў, што паколькі на галіну была зроблена стаўка, укладзена нямала сродкаў, трэба паглыбляцца, пашыраць лінейку тавараў, якія вырабляюцца.

СЭНС СПРАЧАЦЦА?

Далей адбылася нарада па развіцці льнаводства і перапрацоўцы лёну.

Прэзідэнт нагадаў, што рашэнне займацца льном было прынятае даўно, сёння позна спрачацца, ці правільна гэта. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: ён лічыў, лічыць, а зараз і ўсе пераканаліся, што зрабілі правільна.

Беларускі лідар расказаў, што раней Францыя, Кітай, Расія і іншыя краіны ў дробных маштабах займаліся вырошчваннем лёну. Тады Беларусь была на 6—7 месцы. Пры гэтым ён падкрэсліў: што датычыцца перапрацоўкі і вытворчасці тканін, Беларусь заўсёды была на вышыні.

Зараз Беларусь апынулася на другім месцы па лёне. Францыя якасна працуе, Кітай згарнуў вытворчасць, паколькі ім не хапае пасяўных зямель, ім не да лёну, яны закупляюць валакно і ў нас. Расія працуе, але льнаводства там таксама скарачаецца.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, людзі ўсё больш схіляюцца да карыснага і натуральнага. Лён для краін, якія пацярпелі ад чарнобыльскай трагедыі, — гэта лекі, ільняныя тканіны — выратаванне, што ўсвядомілі і ў Еўропе. «А вытворцаў колькасць памяншаецца. Дык правільна мы зрабілі ці не?» — пацікавіўся ён у прысутных.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: стаўленне да лёну — абуральнае.

«Праходзячы па гэтых цэхах, кіраўнік прадпрыемства проста абмовіўся: вось кароткае валакно, вось гэтае зрабілі, тое зрабілі. Выдатныя тканіны робяць з кароткага льновалакна, мы іх бачылі. Але гэта ўсяго 30—35 % ён перапрацаваў. А астатнія 65—70 % дзе? Спакаваў, кудысьці адправіў, нешта сам зрабіў. Сёння 60—70 % кароткага льновалакна не даюць таго даходу, той эфектыўнасці і прыбытку, якую мы маглі б мець», — канстатаваў ён.

ВЫРАШАЦЬ, А НЕ ЧАКАЦЬ

Прэзідэнт адзначыў, што нараду па лёне адкладалі, напэўна, на працягу года.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз паўтарыў: увага да гэтай тэмы не выпадковая. Лён — гэта адзіны штогод узнаўляльны від сыравіны для тэкстыльнай прамысловасці. Нашы прадпрыемствы выпускаюць спецыялізаваную тэхніку для яго вырошчвання і ўборкі, тады як заводы асвойваюць і развіваюць новыя кірункі выкарыстання льновалакна, кастрыцы і льнасемя.

Зараз у нас аднаўляецца такая, здавалася б, згубленая пазіцыя, як вытворчасць ільнянога алею. Некалькі гадоў таму наша краіна цалкам яго імпартавала.

У краіне вызначыліся з тэхналогіяй вырошчвання, аптымальнымі тэрмінамі сяўбы і ўборкі гэтай сельскагаспадарчай культуры, вызначыліся з работай адпаведных прадпрыемстваў, але разам з тым сітуацыя ў галіны — не радасная. Маленькі прырост ёсць, дынаміка ў патрэбным кірунку. «Але гэта ж слёзы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўніка дзяржавы насцярожыла, што на нарадах, прысвечаных гэтай тэме, рэгулярна абмяркоўваюцца адны і тыя ж пытанні. «Праблемы ёсць як у вытворцаў лёну, так і ў яго перапрацоўшчыкаў. Аднак эфектыўных рашэнняў не прапаноўваюць ні губернатары, ні ўрад», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы паставіў перад удзельнікамі нарады наступныя пытанні: чаму па-ранейшаму не выконваюцца рэгламенты па падборы глеб і іх апрацоўцы? Што перашкаджае сеяць лён і падымаць ільнотрасту ў агратэхнічныя тэрміны? Чаму для закладкі таварных пасеваў выкарыстоўваецца насенне ніжэй трэцяй рэпрадукцыі?

Далей: якая работа праведзена ў краіне па стварэнні машын для ўсяго тэхналагічнага цыкла? Чаму ў ільнасеяльных арганізацый дагэтуль няма неабходнай тэхнікі для вырошчвання і ўборкі лёну?

Акрамя таго, што перашкаджае поўнай загрузцы вытворчых магутнасцяў нашых льнозаводаў?

Чаму яны працуюць неэфектыўна, а іх мадэрнізацыя звялася да банальнай замены зношаных вузлоў і агрэгатаў? У чым прычына адсутнасці якаснага льновалакна ў неабходным аб'ёме і невыканання дзяржзаказу?

Задача нарады была такой: аб'ектыўна вызначыць праблемныя пытанні з тым, каб вывесці, нарэшце, льняную галіну на эфектыўны ўзровень работы.

ЧАС АДКАЗВАЦЬ

Падчас нарады кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу прысутных на жорсткіх мерах у выпадку невыканання тэхналогій вырошчвання лёну.

На гэты аспект звярнуў увагу дырэктар РУП «Інстытут лёну» Іван Голуб. Гэта значыць, мае месца адыход ад рэкамендацый навукоўцаў і спецыялістаў у гэтай сферы, што наўпрост уплывае на ўраджайнасць.

Прэзідэнт заявіў наступнае: калі ў 2019 годзе АПК і Нацыянальная акадэмія навук Беларусі не пракантралююць выкананне тэхналогій пры вырошчванні лёну, то будуць прыняты самыя жорсткія меры. Практычная работа на месцах — зона адказнасці губернатараў.

Яшчэ беларускі лідар адзначыў, што ўсіх кіраўнікоў, якія добра працуюць па важных пытаннях і кірунках, трэба падтрымліваць. Не толькі ордэнам, але і яшчэ чымсьці.

ТЭХНІЧНЫ БОК ПЫТАННЯ

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў — ніякага імпарту, неабходна арганізаваць на айчынных прамысловых прадпрыемствах выпуск усёй наменклатуры неабходных запасных частак для рамонту тэхнікі.

«Ужо цяпер збярыце заказы, дапусцім, з ільнокамбіната. Аж да стварэння цэхаў па імпартазамяшчэнні ў той жа Оршы. Усё мы павінны рабіць у сябе, бо будуць вазіць з-за мяжы», — сказаў Прэзідэнт.

Чаму возяць цяпер? Беларускі лідар адказаў: таму што там адкаты, так званыя камісійныя — 8—15 %. Кіраўнік дзяржавы анансаваў, што днямі будзе расказана «яшчэ адна эпапея». Так, некалькі дзясяткаў кіраўнікоў папаліся на гэтым самым імпарце, людзі ўжо затрыманы.

Ён заявіў, што вытворчасць некаторых дэталяў можна даручыць айчынным прадпрыемствам — напрыклад МТЗ, «Гомсельмашу». Дарэчы, гэта датычыцца не толькі тэхнікі для льноперапрацоўкі. Таксама Прэзідэнт паставіў задачу больш шырока выкарыстоўваць айчынныя тканіны на швейных прадпрыемствах, у тым ліку камвольных і льняных.

ПРА КІРАЎНІЦТВА

Дарэчы, падчас нарады кіраўнік дзяржавы расказаў, чаму Міхаіл Русы захаваў свой пост. Паводле яго слоў, на адным з сайтаў напісалі, што, напэўна, з Русым будуць разбірацца па выніках года. «Абсалютна правільна. І Русага з сённяшняга дня б не было, але як чалавек вясковы я разумею: быў усё ж такі не лепшы год. Справа не ў надвор'і, але быў далёка не лепшы год», — канстатаваў ён.

Беларускі лідар зноў звярнуў увагу на залежнасць дзеянняў кіраўніцтва і вынікі: калі б губернатары аддавалі таму ж ільнаводству большую ўвагу, эфектыўнасць была б вышэйшая. Прэзідэнт папярэдзіў: Міхаілу Русаму і міністру сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніду Зайцу трэба вырашыць гэтае пытанне ў 2019 годзе.

УВАГА — ЭКСПЕРЫМЕНТ!

Кіраўнік дзяржавы даў на нарадзе цікавае даручэнне губернатарам. Сутнасць такая: кожны з іх бярэ зямлю, якую дзеліць на тры часткі. Частку пры гэтым засеюць імпартным насеннем лёну, а іншыя — рознымі айчыннымі. Аднак загадана пры гэтым цалкам выканаць усе тэхналогіі. Калі кіраўнік дзяржавы наведае тую ці іншую вобласць, глядзець, што атрымалася, будуць менавіта на гэтых палях.

Дарэчы, падчас візіту Прэзідэнта было сказана пра тое, што беларускія сарты насення лёну лепш за замежныя.

ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ

На нарадзе ўважліва разгледзелі ўсе этапы вырошчвання, вытворчасці і перапрацоўкі лёну. Як адзначыў Міхаіл Русы, распрацаваны доўгатэрміновы механізм выдзялення зямельных плошчаў для вырошчвання лёну-даўгунцу, прыняты неабходныя кадравыя рашэнні, вызначаны сыравінныя зоны для вырошчвання лёну і комплекс машын, атрыманы новыя раяніраваныя высокаэфектыўныя сарты.

Падрабязна на нарадзе разглядалася пытанне навуковага забеспячэння ў льнаводстве. Таксама казалі пра льнонасенстанцыі — іх колькасць павінна быць засяроджана, распыляцца не трэба.

Было даложана аб стварэнні машын для перапрацоўкі лёну. На парадку дня ў тым ліку кааперацыя з вядомым бельгійскім вытворцам падобнай тэхнікі. Даручэнне атрымаў і прамысловы сектар: максімальна забяспечыць аграрыяў, і не толькі дэталямі для рамонту тэхнікі, якія пакуль не вырабляюцца ў Беларусі.

Што яшчэ абмеркавалі? Закупачныя цэны на льновалакно, авансаванне, забеспячэнне захаванасці ўраджаю льнотрасты і атрыманай з яе сыравіны, і, зноў жа, паглыбленую перапрацоўку льняной сыравіны, атрыманне шырокага спектру новай запатрабаванай у Беларусі і за мяжой прадукцыі.

«Рыса падведзена», — заявіў беларускі лідар у заключэнне.

Паводле яго слоў, кіраўнікоў рознага ўзроўню ратуе толькі тое, што ёсць дынаміка ў льнаводчай галіне мінімальна станоўчая, перш за ўсё дзякуючы Аршанскаму льнокамбінату, які стаў больш якасна працаваць. Безумоўна, няпросты год быў і па ўмовах надвор'я.

«Гэта вас ратуе. Усё. Адступаць няма куды», — канстатаваў ён.

Беларускі лідар дадаў, што нарада важная нават не дэталямі, у якія паглыбіліся. Добра, што губернатары, паколькі ім жа гэта рэалізоўваць, пачулі вастрыню гэтага пытання.

Але галоўнай Прэзідэнт назваў адказнасць, таму сам па сабе важны факт таго, што ўдалося сабрацца і яшчэ раз, жорстка пагаварыўшы, вызначыцца.

Прэзідэнт заклікаў прысутных не даводзіць сітуацыю да абсурду. Ён даручыў давесці ўсе заданні кожнай вобласці, колькі і дзе сеяць, каб потым прадаць патрэбную колькасць валакна.

Абмеркавалі і іншыя пытанні, звязаныя з Оршай.

Беларускі лідар падкрэсліў: Орша — гэта маяк, горад, у якім адпрацоўваюцца тэхналогіі, а пазней вопыт плануецца перадаць і іншым гарадам.

«Да канца 2020 года мы павінны забыць пра Оршу — у добрым сэнсе слова, — заявіў ён. — Таму туды, у новую пяцігодку, цягнуць ні ў якім разе нельга».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ,
г. Орша.

Парламенцкі дзённік

ВЯЗАЦЬ ВЕНІКІ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

Савет Рэспублікі ўхваліў законапраект, які спросціць для насельніцтва нарыхтоўку дроў і галін

Учора на чарговым пасяджэнні пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання сенатары ўхвалілі змяненні і дапаўненні ў Лясны кодэкс.

У прыватнасці, прапануецца ўпарадкаваць выдзяленне ўчасткаў ляснога фонду для нарыхтоўкі драўніны на корані як фізічным, так і юрыдычным асобам пры правядзенні іншых высечак. «Зараз гэта досыць праблематычна ў сувязі з неабходнасцю ўнясення змяненняў у лесаўпарадкавальны праект, — растлумачыў журналістам **першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Валянцін ШАТРАЎКА.** — Пасля змянення заканадаўства гэта будзе не патрэбна, рашэнне будзе прымацца юрыдычнай асобай, каб насельніцтва магло нарыхтоўваць сабе дровы ў лесе больш проста».

Першы намеснік міністра растлумачыў, што цяпер дзеля атрымання такога дазволу дастаткова будзе звярнуцца ў лясніцтва, і пытанне вырашыцца на працягу максімум двух дзён.

Таксама прапануюцца змяненні ў сувязі з адсутнасцю ў заканадаўстве азначэння «найважнейшыя інвестыцыйныя аб'екты». Гэта важна пры ажыццяўленні арэнды ляснога фонду дрэваперапрацоўчымі арганізацыямі. Прапануецца дэлегаваць Савету Міністраў права вызначаць крытэрыі выдзялення гэтых участкаў і дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы, якія маюць права атрымаць іх у арэнду. Гэта таксама ўпарадкуе сітуацыю, бо апошнім часам назіраецца пэўная дыспрапорцыя ў выдзяленні такіх участкаў, заўважыў Валянцін Шатраўка.

Акрамя таго, праект закона ўзмацняе адказнасць юрыдычных асоб, якім участкі ляснога фонду даюцца ў арэнду. «Справа ў тым, што юрыдычныя асобы не ўвесь аб'ём драўніны нарыхтоўваюць на гэтых участках, — растлумачыў першы намеснік міністра. — Прапануецца ўнесці таксавы кошт драўніны на корані за ўвесь аб'ём драўніны».

Яшчэ адна норма спрашчае для насельніцтва працэдуру доступу для нарыхтоўкі галін для выкарыстання ў рамесніцкай і прадпрымальніцкай дзейнасці.

Закон уступіць у сілу праз тры месяцы пасля падпісання кіраўніком дзяржавы. Чакаецца, што гэта адбудзецца ў сярэдзіне сакавіка.

Усяго на гэтым пасяджэнні сесіі члены Савета Рэспублікі разгледзелі восем законапраектаў, у тым ліку змяненні ў законы «Аб раслінным свеце», «Аб бяспецы генна-інжынернай дзейнасці», змяненні ў некаторыя законы па пытаннях прававой аховы тапалогій інтэгральных мікрасхем і шэраг ратыфікацый міжнародных дакументаў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.